# ПЕРШАМУ ГОДУ 11-й ПЯЦІГОДКІ—УДАРНЫ ФІНІШ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
12
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 32 (1332)
Выходзіць раз у тыдзень
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
**тэлетайп**
• Учора • Сёння • Заўтра •

## АДБЫЎСЯ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ

**пленум камітэта камсамола універсітэта. У сувязі з пераходам на іншую работу ад абавязкаў намесніка сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце вызвалена А. Гаралёва, ад абавязкаў начальніка штаба працоўных спраў — А. Шыбут.**

**Намеснікам сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце выбраны Л. Гайдукевіч, начальнікам штаба працоўных спраў — А. Чулкоў, інструктарам камітэта камсамола — А. Новік.**

**Л. ВАЛЧОК,**
**загадчыца сектара ўліку камітэта камсамола універсітэта.**

## СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ

**камсамольская канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта завяршыла работу. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола А. Клокаў. У спрэчках выступілі старшы інжынер НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, сакратар камітэта камсамола інстытута А. Шыдлоўскі, старшыня савета маладых вучоных і супрацоўнікаў універсітэта, дацэнт кафедры паўправаднікоў А. Патрын, сакратар камсамольскага бюро ФПМ, аспірант А. Курбацкі, інжынер НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі Л. Стаброўскі.**

**Адбыліся выбары новага саставу камітэта камсамола. Сакратаром выбраны А. Клокаў.**

**С. НІКАЛАЕВА.**

## У КАЛГАСЕ

**імя Жданава Клецкага раёна з шэфскім канцэртам выступілі фальклорная група і танцавальны калектыў механіка-матэматычнага факультэта. Студэнты прысвяцілі яго 60-годдзю БДУ імя У. І. Леніна.**

**Э. АНІСЕНКА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.**

## З РАДЗІМЫ ЛЕНІНА

**прывезлі рускія народныя песні і танцы самадзейныя артысты народнага хору народнай песні Дома культуры 1 Мая. Артысты з Ульянаўска выступілі перад народнай харавой капэлай, зводным хорам і фальклорнай групай універсітэта. Гледачы горача сустрэлі ў іх выкананні песню І. Лучанка «Званы Хатыні».**

**А. БЯЛОЦКІ,**
**студэнт мехмата.**

● ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ

# «Я адчуваю адказнасць...»

НА МЯНЕ глядзяць вясёлыя блакітныя вочы. У іх і жыццярадаснасць, і цяпло, і здзіўленне. Адзін гэты позірк разбурыў нябачную сцяну, якой маё ўяўленне абмежавала Раісу Бяляўскую, чацвёртакурсніцу юрыдычнага факультэта. Выдатнікі вучобы, а Раіса ўжо трэці год запар атрымлівае стыпендыю імя У. І. Леніна, здаюцца нам, пачынаючым студэнтам, людзьмі незвычайнымі. Але я размаўляю з простай, шчырай дзяўчынай. Павольна льецца гаворка.

Рая ўспамінае, як пасля 8 класаў паступіла ў Мінскі фінансава-эканамічны тэхнікум. Такім чынам, студэнцкае жыццё ў яе пачалося яшчэ ў пятнаццацігадовым узросце: новыя знаёмствы, сябры, разуменне таго, што хутка станеш спецыялістам...

Не адразу прыйшлі поспехі. Былі і расчараванне, і разгубленасць, і няўдачы. Нават зрабіла спробу кінуць тэхнікум, але не змагла развітацца са сваім калектывам, а потым сама не заўважыла, як захапілася вучобай і закончыла тэхнікум з выдатнымі адзнакамі.

Пачала працаваць інспектарам аддзела сацыяльнага забеспячэння Маскоўскага раёна горада Мінска. Работа дала ўсведамленне таго, як патрэбна яе спецыяльнасць. Але хутка дзяўчына зразумела: трэба ведаць значна больш, каб быць высокакваліфікаваным спецыялістам.

Праз год Рая стала студэнткай юрыдычнага факультэта БДУ. Вучоба несла з сабой нечаканасці і, зразумела, цяжкасці. Нялёгка было прывыкнуць да вузаўскай сістэмы, але дзяўчына імкнулася выконваць кожнае заданне выкладчыкаў. І ў выніку — толькі выдатныя адзнакі за першую сесію. У далейшым Раіса не зніжала тэмпы.

— Вучыцца на выдатна — гэта галоўная ваша мэта?

— Зусім не, нават ніколі аб гэтым не думаю. А тое, што я ленінская стыпендыятка, дык гэта, гаворачы філасофскімі катэгорыямі, і выпадковасць, і неабходнасць. Звычайнай справай стала для мяне грунтоўная падрыхтоўка да кожных семінарскіх заняткаў, не гаворачы пра залікі і экзамены. Я імкнуся пачэрпнуць максімум ведаў. І раблю гэта не дзеля адзнакі, а для таго, каб стаць сапраўдным юрыстам, які шмат ведае і ўмее свае веды прымяніць з найбольшай карысцю для людзей. Таму мае выдатныя поспехі—заканамернасць. Але я не выключаю, што магу атрымаць па якому-небудзь прадмету іншую адзнаку ў час наступнай сесіі. Выпадковасці здараюцца з кожным.

Рая з цікавасцю расказала пра вынікі летняй практыкі, аб тым, як ёй самой давялося прымаць удзел у разборы некалькіх крымінальных спраў. Потым я слухала пра поспехі 2-й групы, у якой займаецца Бяляўская. На маё пытанне, ці адчувае яна сябе, будучы ленінскай стыпендыяткай, крышачку асаблівай у параўнанні з аднакурснікамі, дзяўчына шчыра рассмяялася:

— Такога не можа быць. Некалькі больш адказнай — гэта іншая справа. Адказнасць я адчуваю на кожным кроку: і калі дапамагаю сябрам, і калі рыхтуюся да заняткаў, і на экзаменах. Адказнасць за сябе і за групу...

Рая — чалавек вельмі заняты. Яна — старшыня савета выдатнікаў універсітэта. Вучоба, грамадская работа. А потым— мастацкая літаратура, тэатр, кіно— гэта своеасаблівы працяг працоўнага дня, гэта крыніцы новых праблем, і кожная патрабуе асэнсавання.

Я развіталася з Бяляўскай з такім адчуваннем, што калі мы сустрэнемся зноў, будзе расказваць Раіса, як працуе, як практычна ажыццяўляе сённяшнія мары. Але да такой сустрэчы два гады вучобы. Чатыры сесіі.

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ШКОЛА МАЛАДОГА КАМУНІСТА

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі пачала сваю дзейнасць «Школа маладога камуніста». Яе праграма разлічана на два гады. Заняткі з новымі членамі КПСС вядзе Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук Д. П. Жмуроўскі. У сваёй першай лекцыі, якая насіла назву «Узрастанне ролі партыі ў камуністычным будаўніцтве», ён расказаў аб разнастайных метадах кіраўніцтва КПСС у сучасны перыяд.

Слухачы школы пазнаёмяцца ў першым навучальным годзе з 12 лекцыямі, якія будуць чаргавацца з практычнымі заняткамі. На семінарах маладыя камуністы атрымаюць магчымасць замацаваць свае веды, лепш разабрацца ў цяжкіх тэарэтычных пытаннях.

**М. ДАНІЛОВІЧ.**

● ТОЛЬКІ ФАКТ

# АБ НАС ПІШУЦЬ

Штомесячны часопіс «Рабоче-крестьянский корреспондент», які выдаецца рэдакцыяй газеты «Правда», апублікаваў агляд шматтыражных газет вышэйшых навучальных устаноў краіны. Прыводзім невялікую вытрымку з артыкула:

**«Актыўнымі памочнікамі парткомаў у выхаванні будучых спецыялістаў з'яўляюцца газеты «Инженер-физик» Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута, «Беларускі універсітэт» (г. Мінск) і некаторыя іншыя. Як правіла, парткомы гэтых навучальных устаноў заахвочваюць вострыя, шчырыя студэнцкія публікацыі, найбольш важныя з іх бяруць пад кантроль, абмяркоўваюць на сваіх пасяджэннях, прымаюць па іх дзейсныя меры».**



**Нядаўна мы адзначалі Сусветны дзень моладзі. Наш універсітэт — сапраўды інтэрнацыянальны. Толькі на факультэце журналістыкі займаюцца 126 студэнтаў з 38 краін Азіі, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

● ПРЫЁМ У БДУ

# ВЕСЦІ СІСТЭМАТЫЧНА, ПЛАНАМЕРНА

ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ ПРАВЯЛА значную работу па арганізацыі прыёму студэнтаў на першы курс усіх форм навучання ў 1981 годзе.

Рэктаратам і парткомам здзяйсняўся пастаянны кантроль за выкананнем плана мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенню прыёму студэнтаў. Былі праведзены інструктыўныя нарады і семінары з супрацоўнікамі універсітэта, якія прыцягваліся да работы ў прыёмнай камісіі, прааналізаваны планы мерапрыемстваў факультэтаў. Штотыднёва, пачынаючы са студзеня, праводзіліся пасяджэнні прыёмнай камісіі. Гэта дало магчымасць па-дзелавому і аператыўна рашаць усе пытанні.

Для прыцягнення ва універсітэт выпускнікоў сярэдніх школ, рабочай і вясковай моладзі былі шырока выкарыстаны сродкі масавай інфармацыі — друк, радыё, тэлебачанне, кіно. Аб універсітэце і прыёме абітурыентаў у перыядычным друку змешчана 198 публікацый. Выкладчыкамі універсітэта для паступаючых падрыхтаваны і праведзены па тэлебачанню вучэбныя перадачы па фізіцы, матэматыцы, біялогіі, гісторыі, хіміі, беларускай мове, створаны спецыяльны навукова-папулярны фільм «Запрашае універсітэт», які дэманстраваўся праз кінапракат у якасці кіначасопіса ў населеных пунктах Беларусі.

Для паспяховага правядзення прафарыентацыйнай работы былі падрыхтаваны: даведкі аб БДУ імя У. І. Леніна, факультэтах і спецыяльнасцях, 14 брашур, маляўнічыя плакаты і інш. 4850 камплектаў матэрыялаў аб універсітэце і ўмовы прыёму былі разасланы ва ўсе сярэднія школы рэспублікі, у 111 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, у 180 ГПТВ, СПТВ, у 257 маладзёжных інтэрнатаў. У 139 сярэдніх школах Мінска былі вывешаны фотаплакаты, ва ўстановы і арганізацыі, якія адпавядаюць профілю навучання ва універсітэце, высланы 820 пісьмаў з умовамі прыёму. Больш 2000 адзінак матэрыялаў выслана па індывідуальных запытаннях моладзі.

У 1981 годзе 4 агітбрыгады, у састаў якіх уваходзіла 104 супрацоўнікі, выязджалі ў гарады і вёскі БССР. Удзельнікамі агітбрыгады было праведзена звыш тысячы лекцый і гутарак аб універсітэце ў сярэдніх школах, вучылішчах, тэхнікумах, на прадпрыемствах і ва ўстановах, распаўсюджана звыш 6 тысяч буклетаў і брашур, 1880 плакатаў, 850 газет, 14,5 тысяч кароткіх даведак аб факультэтах і аддзяленнях універсітэта. Акрамя таго, прафарыентацыйная работа праведзена ў 112 раёнах, замацаваных за факультэтамі і агульнауніверсітэцкімі кафедрамі. Агітацыйна-масавымі мерапрыемствамі ў 1980—1981 навучальным годзе было ахоплена звыш 39 тысяч вучняў, вясковай і працоўнай моладзі.

На ўсіх факультэтах праведзены «Дні адкрытых дзвярэй», у час якіх факультэты наведала звыш 8000 чалавек. Асабліва паспяхова прайшлі «Дні адкрытых дзвярэй» на механіка-матэматычным, фізічным і геаграфічным факультэтах.

Актыўны ўдзел у прафарыентацыйнай рабоце прынялі студэнты ўсіх форм навучання. У час зімовых канікулаў і ў перыяд праходжання практыкі студэнты выступалі з гутаркамі аб універсітэце ў сваіх школах, у працоўных калектывах, ва ўстановах.

Для аказання дапамогі паступаючым ва універсітэце былі арганізаваны падрыхтоўчыя курсы.

На факультэтах працавалі «школы юных», у якіх займалася 1396 школьнікаў Мінска.

У выніку праведзенай работы — нягледзячы на памяншэнне выпуску вучняў сярэдніх школ у рэспубліцы са 147,3 тысяч чалавек у 1980 годзе да 141 тысячы чалавек у 1981 годзе—універсітэт забяспечыў у параўнанні з мінулым годам больш высокі конкурс паступаючых пры якаснай падрыхтоўцы выпускнікоў сярэдніх школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Сёлета конкурс паступаючых ва універсітэт склаў 2,4 чалавека на месца. Гэтай вышэй, чым у сярэднім па ВНУ рэспублікі (2,1). На ўсіх факультэтах конкурс у гэтым годзе быў вышэй за мінулагодні. Найбольшы конкурс на дзённае навучанне быў на спецыяльнасці: гісторыя — 4 чалавекі на месца; правазнаўства — 3,9; філасофія — 3,8; палітэканомія — 3; геаграфія, беларуская і руская мова і літаратура — 2,8.

Уступныя экзамены праводзіліся ў строгай адпаведнасці з «Правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы СССР на 1981 год», «Інструктыўным пісьмом» Мінвуза СССР № 4 ад 1 красавіка 1981 г. і па праграмах, зацверджаных Мінвузам СССР і складзеных у адпаведнасці з праграмамі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

З 4051 абітурыента, якія трымалі ўступныя экзамены, здалі ўсе экзамены 2778 чалавек (што складае 68,6 працэнта), у тым ліку: на выдатна — 600 чалавек, на выдатна і добра — 1005 чалавек, на здавальняюча, а таксама на змешаныя адзнакі — 1173 чалавекі. Атрымалі нездавальняючыя адзнакі 675 чалавек, што склала 17,7 працэнта ад агульнай колькасці здаваўшых экзамены. Сёлета на ўсе формы навучання падалі заявы 974 медалісты, у тым ліку на дзённае аддзяленне — 791.

Сакратарыятам прыёмнай камісіі праведзены аналіз уступных экзаменаў па многіх напрамках (па медалістах, падрыхтоўчых курсах, прыйшоўшых з вытворчасці і г. д.). Выяўлены школы, якія забяспечвалі больш якасную падрыхтоўку вучняў па ўсіх прадметах уступных экзаменаў, а таксама школы, выпускнікі якіх паказалі слабыя веды. Сумесна са старшынямі экзаменацыйных камісій праведзены аналіз найбольш распаўсюджаных памылак па ўсіх дысцыплінах. Гэтыя матэрыялы перададзены ў вучэбна-метадычны аддзел Мінвуза БССР і Міністэрства асветы рэспублікі.

Універсітэт выканаў план прыёму студэнтаў па ўсіх спецыяльнасцях і формах навучання. На дзённую форму навучання залічана 1956 студэнтаў, на вячэрнюю — 440, на завочную—606, усяго 3002 чалавекі. Найбольш высокія прахадныя балы для школьнікаў па дзённаму навучанню былі на наступныя спецыяльнасці: правазнаўства — 24; філасофія — 24; гісторыя — 23; геаграфія — 23; найбольш нізкія: матэматыка (пед. паток)—19,5; механіка — 18.

Патрэбна адзначыць, што на асобных факультэтах не ўдзялялася патрэбнай увагі зваротнай сувязі са школамі, органамі народнай асветы, прамысловымі прадпрыемствамі, дзе праводзілася работа па прафарыентацыі. Па віне асобных факультэтаў часта ўносіліся змены ў састаў тэхнічнага персаналу і экзаменацыйных камісій. Большасць агульнауніверсітэцкіх кафедр неахвотна прымала ўдзел у выдзяленні выкладчыкаў для паездкі ў саставе агітбрыгад па раёнах рэспублікі для правядзення прафарыентацыйнай работы. Вылічальны цэнтр не заўсёды забяспечваў своечасовую статыстычную апрацоўку матэрыялаў, якія звязаны з наборам студэнтаў.

У будучым неабходна ўзмацніць прафарыентацыйную работу факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедр у замацаваных раёнах рэспублікі, весці яе сістэматычна, планамерна.

**Р. ЖМАЙДЗЯК,**
**адказны сакратар прыёмнай камісіі.**

● У ЛЕТАПІС НАРОДНАЙ СЛАВЫ

# У «ЗОРНЫМ» ПАХОДЗЕ

ПЯЦЬ студэнцкіх груп універсітэта прымаюць удзел у «зорным» паходзе па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа. На тэрыторыі Беларусі і Прыбалтыкі яны збіраюць звесткі аб гераізме савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны і працоўных подзвігах. Паход прысвечаны 64-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Перад пачаткам паходу студэнтаў горача віталі член парткома універсітэта, старшыня савета ветэранаў вайны, дацэнт І. В. Марчанка, доктар гістарычных навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі, старшыня праўлення спартыўнага клуба Н. М. Кройтэр.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

# ФОТАРЭПАРЦЁР
## у вылічальным цэнтры



**НА ЗДЫМКАХ: аператар ЭВМ Людміла Краўцова не толькі выдатны работнік, камуніст, але яшчэ і студэнтка 4 курса завочнага аддзялення мехмата.**



**«ЭВМ адказвае...»**



**Рашэнне гасдагаворных задач на ЭВМ «ЕС 1022» вядуць былы выпускнік ФПМ старшы выкладчык І. Камароўскі і аператар Т. Кепчык.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

● ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

# ЗА ТРЫВАЛЫЯ ВЕДЫ

Закончыўся дзень. За вокнамі загараюцца вулічныя ліхтары. Паступова пусцеюць калідоры і аўдыторыі універсітэта. Толькі тут пануе ажыўленне: у студэнтаў першай групы другога курса аддзялення палітэканоміі ідуць практычныя заняткі па тэарэтычнай статыстыцы.

— Сёння мы будзем рабіць статыстычныя табліцы і дыяграмы,— сказаў выкладчык Леанід Сцяпанавіч Вараб'ёў.

І вось ужо студэнты схіляюцца над сшыткамі — заданне складанае, адказнае і разам з тым цікавае. Нешта вылічвае на дошцы Лена Гутарава, а затым упэўнена чэрціць і распісвае табліцу ўраджайнасці збожжавых у калгасах і саўгасах краіны.

— Мне вельмі падабаюцца заняткі па тэарэтычнай статыстыцы, — гаворыць студэнт з Эфіопіі Бекеле Гетачау. — Гэты прадмет цесна звязаны з эканомікай, з нашай будучай прафесіяй. Таму з такой цікавасцю студэнты-палітэканомы працуюць на практычных, у групе няма пасіўных.

...У аўдыторыі пачынаюць чарціць дыяграмы. Спачатку —лягчэйшыя, лінейныя, а потым кругавыя. Наташа Касалапава на дошцы малюе графік аб выпусках вучняў агульнаадукацыйных школ. Зблыталася крыху. Не паспела нават падумаць, як сябры пачалі папраўляць, кожны жадаў даказаць сваю думку. Прыйшлося ўмяшацца выкладчыку, каб знайсці правільнае рашэнне.

Леанід Сцяпанавіч зацікаўлены, каб студэнты ведалі не толькі тэорыю, але добра спасціглі і практыку. І яны шукалі, акрамя асноўнага, іншыя спосабы рашэння. А заданні былі цікавыя. Выкладчык пастараўся выбраць такія, якія цесна звязаны з будучай працай цяперашніх студэнтаў.

Званок застаў усіх нечакана. Ішла зацікаўленая размова, Марына Зянькова чарціла картаграму размяшчэння насельніцтва Беларусі...

Аўдыторыя апусцела. Але заўтра яна зноў запоўніцца студэнтамі, якія будуць у ёй набываць веды.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**студэнт журфака.**

● СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

# ГАРАНТЫЯ ПОСПЕХУ

ЧАС ЗНАХОДЖАННЯ ў камсамоле маладых выкладчыкаў і супрацоўнікаў — гэта яркае, змястоўнае жыццё, цікавы творчы пошук, работа, вучоба. Арыенціры ў рабоце—патрабаванні, якія прад'яўляюцца да маладога спецыяліста. А спецыяліст — гэта чалавек, які авалодаў асновамі марксізму-ленінізму, ясна бачыць палітычныя патрабаванні партыі і краіны, дасканала валодае спецыяльнасцю, умелы арганізатар, які можа працаваць з людзьмі, прыслухоўваецца да думак сяброў, практычна ацэньвае дасягнутае, чалавек высокай культуры і эрудыцыі.

І ад таго, наколькі актыўны выкладчык або супрацоўнік універсітэта, як ён умее арганізаваць сваю работу, наколькі будзе пастаянна імкнуцца папоўніць свае веды, залежыць яго агульнаадукацыйны ўзровень, узровень ведаў яго студэнтаў, узровень работы ўсіх падраздзяленняў універсітэта. У большасці камсамольскія арганізацыі супрацоўнікаў умеюць творча падыходзіць да вырашэння праблем, якія датычаць павышэння якасці выкладання, узроўню навуковай дзейнасці, вытворчасці.

Разам з тым, час патрабуе, каб камітэт камсамола выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта больш увагі звяртаў на камсамольскія арганізацыі з правамі пярвічных. Кожная пярвічная арганізацыя павінна мець канкрэтную справу, якая б з'яднала калектыў.

Цэнтральнае месца ў рабоце камітэта камсамола мае падрыхтоўка і правядзенне Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС—у жыццё!», які праходзіў у гэтым годзе ў рамках Усесаюзнай ленінскай паверкі. Камітэтам камсамола быў распрацаваны і зацверджаны план правядзення асноўных мерапрыемстваў Ленінскага заліку. Па рэкамендацыі камітэта камсамола БДУ ў камсамольскіх арганізацыях падраздзяленняў былі створаны атэстацыйныя камісіі, у састаў якіх увайшлі прадстаўнікі партыйных, камсамольскіх арганізацый, адміністрацыі, вядучыя супрацоўнікі падраздзяленняў.

Этапная праверка ходу Ленінскага заліку, праведзеная ў канцы мінулага года, паказала, што камітэты камсамола дапускаюць памылкі ў гэтай рабоце. Так, не ўсе камсамольцы мелі дакладнае ўяўленне аб Ленінскім заліку, а створаныя атэстацыйныя камісіі не здзяйснялі кантроль за ходам заліку ў перыяд паміж грамадска-палітычнымі атэстацыямі.

Пытанням падрыхтоўкі і правядзення чарговага этапа Ленінскага заліку прысвячалася нарада-семінар камітэта камсамола супрацоўнікаў з сакратарамі камсамольскіх арганізацый падраздзяленняў. На ім падведзены вынікі падрыхтоўкі да Ленінскага заліку. Удзельнікі семінара былі азнаёмлены з распрацаванымі камітэтам камсамола БДУ метадычнымі рэкамендацыямі і ўказаннямі па правядзенню асноўных мерапрыемстваў Ленінскага заліку і па складанню грамадска-палітычнай характарыстыкі камсамольца.

Грамадска-палітычная атэстацыя праводзілася ў форме сходаў, на якія запрашаліся створаныя ў падраздзяленнях атэстацыйныя камісіі. Кожны камсамолец трымаў справаздачу перад сваімі таварышамі і атэстацыйнай камісіяй аб выкананні ўсіх пунктаў асабістага комплекснага плана, які прыняты на папярэдняй атэстацыі. Атэстацыйная камісія дала ацэнку кожнаму камсамольцу, якая зацвярджалася камсамольскім сходам. У ходзе атэстацыі былі прыняты асабістыя комплексныя планы на 1981—1982 гады, у якіх камсамольцамі былі ўзяты абавязацельствы па ажыццяўленню рашэнняў XXVI з'езда КПСС у першым годзе XI пяцігодкі.

Вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі былі падведзены на сходах, якія праходзілі ў падраздзяленнях. На іх камсамольскія арганізацыі рапартавалі аб выкананні сацыялістычных абавязацельстваў па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС і заверылі партыйныя арганізацыі сваіх падраздзяленняў, што прыкладуць усе свае веды, намаганні для паспяховага выканання пастаўленых задач.

Наогул па нашай арганізацыі атэстацыя прайшла здавальняюча і закончылася ў тэрмін. Але праверкі, якія правялі члены камітэта камсамола, паказалі, што ў некаторых камсамольскіх арганізацыях атэстацыя насіла фармальны характар. Нягледзячы на тое, што ў падраздзяленнях былі створаны аўтарытэтныя атэстацыйныя камісіі, не ўсюды атэстацыя вылілася ў дзелавое, крытычнае абмеркаванне работы кожнага камсамольца, яго асабістага ўкладу ў павышэнне эфектыўнасці і якасці работы, узмацненне дысцыплінаванасці і арганізаванасці. У некаторых камсамольскіх арганізацыях падышлі фармальна і да прыняцця асабістых комплексных планаў, у якіх ёсць шмат агульных пунктаў.

Адным з асноўных напрамкаў у справе выхавання моладзі з'яўляецца вывучэнне марксісцка - ленінскай спадчыны, праграмных дакументаў партыі і ўрада, якія фарміруюць марксісцка - ленінскі светапогляд, класавы падыход да з'яў сучаснасці.

На семінарскіх занятках, на камсамольскіх сходах у групах камсамольцамі былі вывучаны і абмеркаваны асноўныя дакументы партыі і ўрада: матэрыялы кастрычніцкага (1980 г.) Пленума ЦК КПСС, праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гг. і на перыяд да 1990 года», «Справаздачны даклад ЦК КПСС XXVI з'езду Кампартыі Савецкага Саюза» і іншыя матэрыялы з'езда.

Пярвічным камсамольскім арганізацыям належыць шырэй выкарыстоўваць такую форму лекцыйна - прапагандысцкай работы, як лекцыі па міжнароднаму становішчу. Такія лекцыі, якія чытаюць высокакваліфікаваныя лектары, нясуць больш інфармацыі і карыстаюцца большым поспехам у камсамольцаў-супрацоўнікаў, чым палітінфармацыі ў групах. Таму патрэбна часцей запрашаць у камсамольскія арганізацыі лектараў-міжнароднікаў.

Камітэт камсамола выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта разумее, што на сучасным этапе патрэбна яшчэ больш высокая патрабавальнасць да стылю і метадаў камсамольскай работы, каб яна адпавядала задачам камуністычнага будаўніцтва. І гэта асабліва важна ва ўмовах усенароднай барацьбы за выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

**А. КЛОКАЎ,**
**сакратар камітэта камсамола выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.**



**«Будучы вучоны».**

**Фотаэцюд В. ШАЧАКА.**

● БУДНІ БІБЛІЯТЭКІ

# НА ПУЛЬСЕ ЧАСУ

АДДЗЕЛ МАСАВАЙ работы універсітэцкай бібліятэкі ўжо год лічыцца самастойным падраздзяленнем. Бібліятэка заўсёды ўдзяляла патрэбную ўвагу пытанням прапаганды кнігі. Арганізацыя ж такога аддзела дала магчымасць яшчэ больш шырока разгарнуць правядзенне масавых мерапрыемстваў сярод студэнтаў і супрацоўнікаў, а таксама больш дакладна каардынаваць гэту работу ўнутры бібліятэкі.

Напрыклад, вялікую аўдыторыю чытачоў прыцягваюць адкрытыя прагляды літаратуры, якія арганізуе аддзел. Такі прагляд «У дапамогу маладому камуністу» быў арганізаваны для выкладчыкаў «Школы маладога камуніста» на факультэтах і прыўрочаны да іх нарады. Матэрыялам з'езда прысвечаны выстаўкі ў бібліятэцы і на факультэтах: «З'езду партыі — выдатную вучобу», «КПСС ва ўмовах развітога сацыялізму», «СССР—сцяганосец міру», «Мы—інтэрнацыяналісты», «Роля партыі ў развіцці навукі», «Кампартыя Беларусі — баявы авангард беларускага народа» і іншыя. Ілюстрацыйная выстаўка і агляд па тэме «Вобраз Леніна ў выяўленчым мастацтве» былі прыўрочаны да правядзення навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, прысвечанай 111-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна на фізічным факультэце. У інтэрнатах арганізаваны стэнды фотаплакатаў «Камсамол у XI пяцігодцы», «Да новых вышынь у камуністычным будаўніцтве», «За мір трэба змагацца».

Пры дапамозе аддзела масавай работы арганізуецца палітклуб на гістарычным факультэце. Намечаны цыклы выставак і рэкамендацыйныя спісы літаратуры аб развіцці ў XI пяцігодцы галін народнай гаспадаркі; адкрыты кансультацыйны пункт па прапагандзе матэрыялаў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, дзе скамплектаваны і арганізаваны фонд у дапамогу прапагандыстам; дзейнічае выстаўка «У дапамогу тым, хто вывучае матэрыялы XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ».

План работы аддзела масавай работы ўзгадняецца як з агульнауніверсітэцкім планам ідэйна-выхаваўчай работы, так і з планамі асобных факультэтаў, курсаў, груп. Сувязным звяном паміж бібліятэкай і студэнтамі з'яўляецца куратар, таму вялікая ўвага ўдзяляецца кантактам з саветам куратараў і камсамольскім актывам факультэтаў і студэнцкіх груп. Супрацоўнікі аддзела выступаюць на сходах, пасяджэннях кафедр, каб праінфармаваць аб метадычнай дапамозе, якую можна атрымаць.

Вопыт паказаў, што ў садружнасці з куратарамі можна правесці цікавыя і карысныя мерапрыемствы. Так, у мінулым навучальным годзе разам з кіраўніцтвам гістарычнага факультэта была праведзена навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная Дню Перамогі. Быў прачытаны даклад, выкарыстаны запісы з фанатэкі, аформлена ілюстрацыйная выстаўка. Арганізоўваліся вечары і сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, канферэнцыі чытачоў па кнігах савецкіх пісьменнікаў. Цікава прайшоў літаратурны вечар, прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры К. Крапівы. У гасцях у студэнтаў пабываў народны артыст СССР Л. Р. Рахленка і іншыя вядомыя людзі. Метадычную дапамогу куратарам аддзел аказвае і ў правядзенні тэматычных палітінфармацый.

Зараз аддзел масавай работы рыхтуецца да знамянальных дат—60-годдзя БДУ імя У. І. Леніна, 100-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа і Я. Купалы, 60-годдзя з дня ўтварэння СССР.

**Р. ЛЯХОВІЧ,**
**загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі.**



**Практычныя заняткі па анатоміі чалавека ў другакурснікаў біяфака праводзіць дацэнт К. І. Грышан.**
**Фота В. ШАЧАКА.**

● СПОРТ

# ВЫСТУПІЛІ ЎДАЛА

НЯДАЎНА ў Мінску праходзіў Усесаюзны турнір па дзю-до, прысвечаны памяці вядомага дзеяча Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы В. І. Казлова. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 250 барцоў з усяго Савецкага Саюза, а таксама і зборная каманда нашага універсітэта.

У перпы дзень спаборніцтваў чэмпіёнам у сярэдняй вазе (86 кг) стаў студэнт І курса юрыдычнага факультэта Валянцін Матарас. Ён упершыню выканаў норматыў майстра спорту СССР, выйграўшы ўсе сустрэчы датэрмінова. У другі дзень спаборніцтваў рабяты, натхнёныя перамогай Валянціна, змагаліся з запалам. І зноў на п'едэстал гонару падняўся студэнт універсітэта Уладзімір Дуднік. Валодзя — таксама студэнт юрыдычнага факультэта, займаецца на III курсе. Ён заваяваў ва ўпартай барацьбе бронзавы медаль у вазе да 65 кг, дзе ўдзельнічала самая вялікая колькасць спартсменаў.

**М. БРЫТКОЎ,**
**трэнер.**



Выступае дзіцячы хор — удзельнік святкавання 60-годдзя універсітэта.

● СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# ГУЧАЦЬ «НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ»

СЯРОД літаратурных аб'яднанняў, якія актыўна дзейнічаюць у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах рэспублікі, вылучаецца літаб'яднанне «Наднёманскія галасы», што працуе пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. Кіруе ім былы выпускнік БДУ імя У. І. Леніна Міхась Губернатараў.

Нядаўна выйшаў у свет зборнік вершаў — першая друкаваная кніжка гродзенскіх студэнтаў.

...Я паціху гартаю паэтычныя старонкі. Спыняю позірк на вершы «З першым вясновым громам» Надзеі Горбік. Шмат разоў перачытваю свежыя радкі маладой паэтэсы і радуюся, што яе «песня спее ў сэрцы, просіцца ў свет шырокі».

Зінаіда Данілевіч піша на рускай мове. Больш за ўсё яе хвалюе тэма прыроды. Радуе назіральнасць маладой паэтэсы, яе любоў да роднай зямлі. Вось некалькі радкоў з вершаў «Усталые птицы» і «Самоотречение дождя»:

...Быть может, в какой-нибудь
луже унылой
Последний кусочек свой
солнце забыло...

***

Самоотречение дождя —
В землю уходя, остаться
жить...

Сказана вельмі добра. Адчуваецца асаблівасць паэтычнага погляду, свежасць вобразаў.

Самы юны аўтар «Наднёманскіх галасоў» — Юрка Ленец. Ён выступае ў зборніку з надзвычай цікавай падборкай вершаў. Пачатковец настойліва імкнецца авалодаць сістэмай народнага светаўспрымання. Адсюль — і густая метафарычнасць, і цяга да поліфанічнасці пісьма. Мастацкаму вобразу ён імкнецца надаць максімальную выразнасць, апрадмечанасць і рэльефнасць:

Праменні сонца ў стагі
сабраны,
Вятрамі пожня закалыхана.
Лягло на плечы дубровам
неба,
А дых займае ад паху хлеба.

Восем вершаў у зборніку змясціла Ганна Лебядзевіч. Творы яе прасякнуты шчырай любоўю да роднай Беларусі, да чалавека-працаўніка. Прыемна і хораша піша паэтэса і пра каханне. У сваіх вершах яна хоча «адшукаць тую долю, каб кахаць, як ніхто і ніколі».

Толькі адным вершам прадстаўлены Л. Бандарэвіч, А. Католікаў, В. Пастэрняк, Я. Сідаровіч. Але і ў іх творах можна знайсці шмат цікавых дэталяў. У кожнага свая лірычная танальнасць, сваё адметнае ўспрыманне рэчаіснасці.

Як і ва ўсіх пачынаючых паэтаў, у аўтараў «Наднёманскіх галасоў» сустракаюцца часам вельмі кволыя радкі і нават цэлыя вершы. Многія з іх не нясуць адкрыцця, напісаны пашкольнаму. Такія вершы, як «К лету», «Весеннее», «И снова снег!», павінны былі адляжацца ў паэтычных архівах іх аўтараў.

У цэлым жа зборнік «Наднёманскія галасы» пакідае прыемнае ўражанне. Ён сведчыць, што ў маладых сэрцах спеюць песні, вартыя нашага часу.

**С. ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака.**

**Студэнты замежных краін, якія навучаюцца на факультэце журналістыкі, нядаўна наведалі Хатынь. У гэтых допісах — боль і гнеў, рашучае «не» вайне.**

# ПАМЯЦЬ вяртае нас у Хатынь...

ДЗЯКУЮЧЫ экскурсіі ў Хатынь я пазнаёміўся з беларускай вёскай, спаленай разам з жыхарамі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Вось і цяпер у мяне перад вачыма скульптура Іосіфа Камінскага з сынам на руках. Яна сустракае ўсіх, хто ступае на хатынскую зямлю, сваім жалобным выглядам, які быццам гаворыць: «Будзь пракляты, фашызм! Людзі! Аберагайце на зямлі мір!»

Ніколі не забыць нам трагедыю беларускай вёскі. Ніколі не павінна яна больш паўтарыцца. А мы павінны зрабіць усё, каб зберагчы мір на нашай зямлі.

**ХАСАН МАХМУД АБЕД РАБУ РЫБІК (Палясціна).**

МЫ МОЎЧКІ стаялі каля трох бярозак, сімвалізуючых жыццё на зямлі. На месцы чацвёртай — Вечны агонь. Ён гарыць і будзе гарэць заўсёды, як вечная памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за шчасце будучых пакаленняў.

Сёння мы павінны зрабіць усё, каб затушыць на нашай планеце ачагі войнаў, каб свяціла мірнае сонейка, радасна смяяліся дзеці.

**АМАР ЛЕАНАРДА АЛЬВАРАДА ЛУНА (Коста-Рыка).**

НІКОЛІ не забыць мне трагедыю Хатыні. На вякі застанецца ў нашых сэрцах і нашым розуме яна як страшны прыклад фашызму, які імкнуўся знішчыць жыццё мірных людзей. Доўга яшчэ будуць гучаць у маіх вушах званы Хатыні, заклікаючыя да пільнасці.

**МУХАМЕД АХМЕД АЛІ (Аман).**

МЯНЕ ЎРАЗІЎ Вечны агонь. Гэта памяць аб тых, хто загінуў, абараняючы Радзіму, незалежнасць свайго народа. Ён нагадвае гераічнае мінулае савецкага народа. Хочацца зноў вярнуцца ў Хатынь, бо іменна тут пачынаеш разумець, што няма нічога даражэй міру на зямлі.

**ЛУЛБЕДЖЭ ФЕКРЭ (Эфіопія).**

ХАТЫНЬ — гэта сімвалічныя зрубы дамоў, магілы спаленых вёсак, назвы канцлагераў смерці. Хатынь — гэта страшная трагедыя. Усе людзі, прыязджаючыя сюды, задумваюцца над гэтым і праклінаюць войны. «Не! Хатынь не павінна паўтарыцца» — гавораць мае сябры з В'етнама, Сірыі, Амана, Нігерыі, Ірака.

**МАТУМОНА БОН АННЕ ЭМАНУЭЛЬ (Конга).**

ТУТ, У ХАТЫНІ, жылі старыя, жанчыны, дзеці. Яны сустракалі новы дзень з надзеяй у блізкую перамогу, якой дачакацца ім было не суджана. У чым віна гэтых людзей? Чаму іх спалілі жывымі? Хто даў гэткае права фашыстам знішчаць? Хто дае права сёння імперыялістам знішчаць і прыгнятаць любячых мір людзей? Хочацца сказаць ім: «Глядзіце! Гэта Хатынь! Чаму штодня вы паўтараеце трагедыю Хатыні?»

Але я веру, што пройдзе час, і на нашай планеце не застанецца гэткіх людзей, якія знішчаюць... Будуць жыць бабулі, дзеці, маці — усе, хто любіць жыццё, паважае чалавечае ў чалавеку і імкнецца зрабіць наша жыццё прыгожым. Менавіта таму Хатынь жыве і будзе жыць у сэрцах і розумах не толькі савецкага народа, але і усіх людзей планеты, якія змагаюцца за мір ва ўсім свеце.

**СУХЕЛЬ САЛЕМ СААД (НДРЙ).**

● З НАШАЙ ПОШТЫ

## Як падыходзім да свята

**Як рыхтуецца да 60-годдзя роднага універсітэта факультэт журналістыкі, расказвае сакратар партыйнага бюро А. А. Плаўнік:**

— Сумесна з дэканатам, прафбюро і камітэтам камсамола мы склалі план падрыхтоўкі факультэта журналістыкі да агульнауніверсітэцкага свята. Абноўлена наглядная агітацыя, афармлены маляўнічы стэнд «Факультэт журналістыкі». Створаны альбомы газетных публікацый нашых студэнтаў аб сваім факультэце і універсітэце. У інтэрнаце падрыхтаваны і выдатна абсталяваны ленінскі і інтэрнацыянальны пакоі, юбілею прысвячаецца і афармленне чытальнай залы. У планах святкавання — сустрэчы з выпускнікамі факультэта, тэматычны паказ кінафільмаў.

**— Што яшчэ плануеце зрабіць да свята?**

— Закончыць стварэнне летапісу факультэта і экспазіцыі аб журфаку ва універсітэцкім музеі, а таксама рыхтуем спецыяльныя нумары вучэбнай і насценнай факультэцкіх газет.

ЖАРЖЫН РАВАУ,
студэнтка журфака.





## ВОСЕНЬСКІ ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ...



Фота У. ЛІТОМІНА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

12 лістапада 1981 г.

Зак. 1801. АТ 02514

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ